# КАТЭГОРЫЯ ТЭМПАРАЛЬНАСЦІ ЯК СРОДАК СТВАРЭННЯ ВОБРАЗА АЎТАРА І ВОБРАЗА АПАВЯДАЛЬНІКА Ў ТВОРАХ І. ШАМЯКІНА

**М. А. Жмайлік**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*mariyazmeilik@mail.ru; навук. кір. – І. А. Гапоненка, д-р філал. навук, дац.*

У рабоце разглядаюцца граматычныя сродкі выражэння такіх тэкставых катэгорый як «вобраз аўтара» і «вобраз апавядальніка». Аналіз стылістычных магчымасцей граматычных адзінак праводзіўся ў рамках катэгорыі тэмпаральнасці, з дапамогай якой у мастацкім тэксце дасягаецца ўзаемадзеянне ўласна лінгвістычных і экстралінгвістычных фактараў. Выяўлена роля розных дзеяслоўных формаў (прошлага часу закончанага і незакончанага трывання, цяперашняга наратыўнага часу, форм умоўнага ладу і імператываў) як тэкстаўтваральных і стылістычных сродкаў. Устаноўлены пераважаючыя спосабы выяўлення тэмпаральнасці ў творах І. Шамякіна. На аснове аналітычных даных абазначана сувязь паміж стылістычнай роляй сродкаў выражэння тэмпаральнасці і характарыстыкамі вобраза аўтара і вобраза апавядальніка ў творах І. Шамякіна.

***Ключавыя словы***: вобраз аўтара; вобраз апавядальніка; катэгорыя тэмпаральнасці; сродкі выражэння тэмпаральнасці; лінгвістычныя і экстралінгвістычныя фактары.

Мастацкі тэкст уяўляе сабой пэўнае структурна-семантычнае ўтварэнне, складанае адзінства, аб'яднанае разнастайнымі сувязямі, і з'яўляецца аб'ектам даследавання не толькі ў літаратуразнаўстве, а таксама і ў лінгвістыцы. Вывучэнне спецыфікі яго рэалізацыі на лінгвістычным узроўні дазваляе атрымаць уяўленне пра «моўную прастору» твора, а таксама вызначыць асаблівасці ідыястылю пісьменніка. Яшчэ з сярэдзіны XIX стагоддзя даследчыкамі адзначалася, што надзвычай важнай у адносінах стылю з'яўляецца сінтаксічна-граматычная арганізацыя твору. Граматыка «канструе стыль» пісьменніка, а граматычныя адзінкі адыгрываюць вялікую стылістычную ролю ў фарміраванні цэласнага ўспрыняцця тэксту чытачамі і ў правільнай інтэрпрэтацыі задумы самога аўтара.

Унікальнасць мастацкага твору часцей за ўсё вызначаюць дзве найбольш распаўсюджаныя тэкставыя катэгорыі – катэгорыі «вобраза аўтара» і «вобраза апавядальніка», якія ўказваюць на асаблівасці выкладу і паведамлення матэрыялу аўтарам, і пры гэтым выконваюць сэнсаўтваральную і тэкстаўтваральную функцыі.

На думку многіх навукоўцаў, найбольш рэлевантнымі сродкамі стварэння вобраза аўтара-апавядальніка з'яўляюцца функцыянальна-семантычныя катэгорыі мадальнасці, тэмпаральнасці, персанальнасці,

квантатыўнасці, аспектуальнасці. Асаблівае месца ў гэтым шэрагу займае катэгорыя тэмпаральнасці. Тэмпаральнасць (ад лац. *tempus, temporis* ‘час’) з’яўляецца асноўнай тэкста- і сэнсаўтваральнай катэгорыяй. Яе даследаваннем займаліся многія навукоўцы: А. У. Бандарка, І. Р. Гальперын, Р. Дэклер, Л. Дэжэ, З. Я. Тураева, М. М. Леўчанка і інш. Даследчыкі адзначалі, што часавая прастора кожнага тэксту з прычыны сваёй неаднароднасці, шматвобразнасці і складанасці патрабуе асобнага і падрабязнага аналізу. У ёй сумяшчаюцца адлюстраванне аб’ектыўнага свету, а таксама выдумка пісьменніка. Выкарыстоўваючы разнастайныя лексічныя, марфалагічныя, сінтаксічныя, стылістычныя сродкі, кожны аўтар імкнецца стварыць сваю часавую прастору, непаўторнасць якой становіцца адным з маркёраў яго ідыястылю.

У сваім даследаванні мы звярнулі ўвагу на алгарытм пабудовы тэмпаральнага плану твораў і асаблівасці індывідуальнага стылю аднаго з прызнаных майстроў беларускага слова – Івана Шамякіна. На аснове раманаў знакамітага класіка была вызначана роля часавасці ў стварэнні вобраза аўтара і вобраза апавядальніка. Крыніцай фактычнага матэрыялу паслужылі наступныя выданні: «Атланты і карыятыды» (Мінск, 1985); «Вялікая княгіня» (Мінск, 2014); «Вазьму твой боль» (Мінск, 2013).

Асноўнай прыкметай мастацка-стылявой адметнасці творчасці І. Шамякіна многія даследчыкі называюць разгорнутую, ускладненую сюжэтна-кампазіцыйную арганізацыю раманаў і аповесцей пісьменніка, адзначаючы пры гэтым дынамізм іх сюжэтнага развіцця. У мастацкай структуры твораў І. Шамякіна сумяшчаюцца розныя часавыя планы, праз якія раскрываецца адметнасць светабачання як аўтара, так і яго герояў.

У мастацкіх творах катэгорыя тэмпаральнасці эксплікуецца разнастайнымі формамі дзеясловаў. З усіх часцін мовы лінгвісты выдзяляюць дзеяслоў як адну з самых важных і самых складаных часцін мовы. Пры разглядзе стылістыкі дзеяслова асаблівую ўвагу прыцягвае катэгорыя часу, якую характарызуе своеасаблівае функцыянаванне ў розных відах маўленчай дзейнасці, а таксама шырокія экспрэсіўныя магчымасці, дзякуючы багатай сінаніміі часавых форм. Сінтаксічны час не толькі выбудоўвае храналагічны вектар апавядання, але садзейнічае сэнсавым прырашчэнням.

Найчасцей І. Шамякін у сваіх раманах аддае перавагу дзеясловам прошлага часу. З аднаго боку, дзеясловы прошлага часу акцэнтуюць увагу на падзеях мінулага, а з іншага – дэталізуюць стан апавядальніка, персанажа і нават самога аўтара.

У творах І. Шамякіна прошлы час выніковы надае сюжэту дынамічнасць і дакладнасць, пры гэтым перадае змястоўна-фактуальную

інфармацыю: *Ён падняўся з канапы, надзеў на плечы падцяжкі, зашпіліў сарочку. Хацеў было выйсці са спальні, але на па дарозе спыніўся* (Атланты і карыятыды, с. 97); *Алена адчыніла дзверцы павозкі і лёгка выскачыла ў глыбокі снег. Прагна ўдыхнула марознае паветра…* (Вялікая княгіня, с. 7).

Разам з тым, выкарыстоўваючы дзеясловы прошлага часу закончанага трывання, пісьменнік канцэнтруе сваю ўвагу і на ўнутраным стане героя, паказваючы іх узрушанасць, хваляванне, моцны эмацыянальны ўсплёск: *Аляксандр моцна ўзлаваўся. Алена здзівілася і засмуцілася* (Вялікая княгіня, с. 64); *Івана не проста здзівіла, бадай спалохала…* (Вазьму твой боль, с. 199); *Усхвалявала гэта, моцна ўзрушыла – ледзьве не да ліхаманкі. ...Алене перавярнула душу думка, чаму так доўга ў яе не зараджаецца дзіця. Яшчэ больш ашаламіла, што дагэтуль яна не думала пра яго* (Вялікая княгіня, с. 90).

Формы прошлага часу незакончанага трывання ў мастацкім творы быццам запавольваць час, паколькі часцей за ўсё аўтар выкарыстоўвае іх для стварэння пейзажу, навакольнага малюнку, а таксама для характарыстыкі і паказу ўнутранага свету персанажаў. Акрамя таго, успаміны апавядальніка таксама аформлены прошлым незакончаным: *Буйны асенні дождж барабаніў па чарапіцы, па мармуровых падаконніках замка. Трашчалі свечкі, аплаўлены воск сцякаў у сярэбраныя падсвечнікі. Пахла гарэлым воскам* (Вялікая княгіня, с. 152); *Ляжаў, слухаў цішыню і ўспамінаў кожны эпізод далёкага маленства, галоднага юнацтва і нядаўніх сустрэч з маці…* (Атланты і карыятыды, с. 359); *Снежная роўнядзь возера і ў хмарны дзень сляпіла вочы, бо позірку не было за што зачапіцца, раўніна здавалася бясконцай, як неба: на далёкім беразе лес апушыў густы іней, а таму ўвесь свет зліўся ў застылай белі – зямля, вада, неба. Толькі на адлегласці, куды даставалі вочы, белую пустыню пераразала санная дарога* (Вялікая княгіня, с. 177).

Радзей у творах І. Шамякіна сустракаюцца дзеясловы ў формах цяперашняга часу. Хаця іх сэнсавая нагрузка не менш значная.

Формы цяперашняга наратыўнага апавядальнік можа выкарыстоўваць пры апісанні мінулых падзей: *Тася корміць яго таблеткамі раўнаціну, і ён нікому не кажа пра свой ціск, а то, глядзі, пенсіянерам зробішся ў сорак тры гады* (Вазьму твой боль, с. 153–154); *Астаповіч дае ідэі і дакладна вызначае: якую з яго ідэй хто павінен выканаць; сабе пакідае толькі тыя, якія патрэбны «прабіваць» у высокіх інстанцыях яго аўтарытэтам, яго званнямі* (Вазьму твой боль, с. 291).

Вельмі часта пісьменнік выкарыстоўвае адначасова дзеясловы прошлага часу і цяперашняга наратыўнага, пры дапамозе форм якога ён

раскрывае змест, паясняе некаторыя падзеі, а таксама ў пэўнай ступені характарызуе персанажаў: *Але Шчэрбавы дзеці яе расчаравалі. <…> Старэйшая дачка ўжо на ферме робіць, самы малодшы ў чацвёртым класе* (Вазьму твой боль, с. 352); *Бацька добра ўмее слухаць разумныя парады. Ён нават з дзяцьмі сваімі раіўся. Васіля з дванаццаці гадоў у паходы бярэ. І ўнука Дзмітрыя* (Вялікая княгіня, с. 87).

Формы ўмоўнага ладу адлюстроўваюць дзеянні, матываваныя волевыяўленнем суб'екта маўлення. У раманах І. Шамякіна дадзеныя формы выкарыстоўваюцца ў разнастайных значэннях, у тым ліку актывізуюць мадальныя значэнні верагоднасці, магчымасці. Афармляючы роздумы апавядальніка не толькі пра рэальную сітуацыю, але і пра тую, якая магла б быць, умоўны лад паказвае на розныя варыянты развіцця падзей: *Чорт вазьмі, мне лягчэй жылося б, каб я хоць трошкі быў ідэалістам* (Атланты і карыятыды, с. 18); *Але адступленне яшчэ больш унізіла б, маральна растаптала б* (Атланты і карыятыды, с. 48); *Я цябе на паўгодзіка паслаў бы ў слесары, каб не знаў, які дэфіцыт на вашага брата* (Вазьму твой боль, с. 165); *Каб Алена папрасіла зорку з неба, Аляксандр, напэўна, дастаў бы і яе* (Вялікая княгіня, с. 72).

Формы імператыва або загаднага ладу ўносяць у маўленне апавядальніка мадальныя адценні пажаданасці, неабходнасці. У тэкстах І. Шамякіна імператыў выкарыстоўваецца для выражэння патрабавання, звернутага да пэўнага суб'екта: *Алена не вытрымала, абарвала яго: – Не кіпі, князь* (Вялікая княгіня, с. 62); *Думай, аб чым гаворыш. Не разводзі… – але не даказаў, чаго не разводзіць, бо адчуў, што зала настроена супраць яго* (Вазьму твой боль, с. 218); *Няхай едзе вучыцца і выкіне дур з галавы* (Вазьму твой боль, с. 254).

Такім чынам, на аснове аналізу функцыянальна-граматычнай катэгорыі тэмпаральнасці ў творах І. Шамякіна мы выявілі істотны і непасрэдны ўплыў часавасці на стварэнне вобраза аўтара і вобраза апавядальніка. У межах тэмпаральнасці нам удалося даць характарыстыкі разглядаемым катэгорыям. У творах І. Шамякіна вобраз апавядальніка – эмацыянальны, чулы, лірычны – праяўляецца пры выражэнні формамі прошлага закончанага і незакончанага або формамі цяперашняга часу пры характарыстыцы персанажаў. Вобраз аўтара – вобраз псіхолага, філосафа, які канстатуе чалавечыя каштоўнасці жыцця, імкнецца да поўнай гармоніі і суладдзя паміж персанажамі, – праяўляецца ва ўсіх часавых формах).